Сейчас впору бы порассуждать о том, что, дескать, политика — всегда дело грязное. Но не стоит опускаться до банальностей. Пусть эта "невинная корректировка на массы" останется на совести тех политиков, кто не видит в лесу отдельных деревьев, а замечает только безликий лес.

После опубликования обращения, а затем мгновенной реакции наших коллег по творческим союзам в Белорусской конфедерации творческих союзов и культурных фондов возникла весьма напряженная обстановка. Фактически оказалось под угрозой само существование Конфедерации. Но к чести председателей творческих союзов мы сумели, не отводя глаза в сторону, спокойно во всем разобраться и назвать вещи своими именами. Этот горький урок, пожалуй, еще больше сплотил нас и убедительно доказал, как мы нуждаемся друг в друге и самой Конфедерации. И что только сообща можно противостоять всем несуразностям нашей жизни.

Чтобы высказать все это, возможно, и не стоило браться за перо. Прошло время. Как видите, я не спешил "отмываться". Потому что моя совесть, как и совесть уважаемых мною людей — Николая Еременко, Евгения Ковалевского, Ивана Чигринова, — чиста. И это — главное.

Не дает мне покоя не этот инцидент, а обстоятельство иного рода. Впрочем, здесь просматриваются параллели: та же нетерпимость к другому мнению, та же яростная критика, то же стремление всю цветовую гамму жизни свести к двум краскам — белой и черной...

Все идет к тому, что инакомыслие опять становится врагом власти и нации. А следовательно, с ним нельзя не бороться, его нельзя не преследовать, а всех и вся нельзя не делить на "наших" и "ненаших". Только хотелось бы спросить: а кто определил эту грань между "нашими" и "ненашими"? Закон о печати, которого нет? Конституция? Суд, наконец? И на основании чего можно утверждать, что одно издание патриотическое, а другое — нет? Разве что по числу упоминаний на каждой газетной полосе слов "суверенитет", "возрождение", "матчына мова"? Так ведь было уже все это. Было! Главный редактор газеты мог получить строгача лишь за то, что в передовой статье вместо десяти цитат из речи Генерального секретаря ЦК КПСС приводилось лишь три или четыре...

Выходит, опять в железные объятия цензуры? Опять к ласкающим слух чиновников от прессы "запретить", "закрыть", "уволить"? Опять к насилию над разумом? А как же тогда быть со свободой слова? Правом человека высказывать свои мысли, позиции? Или, может, мы не доросли до этого? Еще не созрели?

Сложно и мучительно отрываемся мы от прошлого. Непонятно, куда идем. Но как недалеко ушли, если опять и опять возвращаемся к тому, что уже было.

Ёсць пытанне...

Дакуль "магістры" калямедыцынскіх навук будуць калечыць людзей?

Ціхан ПАНЦЮШЭНКА,
член Саюза пісьменнікаў,
прафесар

Больш года назад маладая жанчына А., жыхарка Мінскай вобласці, заўважыла ў сябе ў грудзях невялікае зацвярдзенне. Урачы мясцовай бальніцы, куды яна звярнулася па дапамогу, параілі аперацыю. Але каму хочацца класціся пад нож? І тут трапіліся "добрыя людзі", якія запэўнілі, што можна адолець бяду і без аперацыі. Знайшоўся і "лекар". Магістр акультных навук.

Пры першай сустрэчы з А. ён сказаў, што выразаць злаякасную пухліну — усё роўна што змагацца з вашывасцю, адшукваючы вошы ў рубцах бялізны. Ракавыя клеткі — гэта паразіты, і іх трэба атручваць, каб яны гінулі, а арганізм пры гэтым заставаўся непашкоджаным.

Лячэнне пачалося з дзесяцідзённага галадання, якое паўтаралася праз кожныя два месяцы. Як тлумачыў лекар, гэта патрэбна для таго, каб пасадзіць "паразітаў" на галодны паёк, а потым прыдушыць іх мачой. Сказана — зроблена. У час галадання жанчына выпівала ўсю сваю мачу. А каб яе менш мучыла смага, магістр дазволіў выпіваць дзве шклянкі на дзень бурачнага соку, адну — маркоўнага, адну — гранатавага і адну — яблычнага без цукру.

Пасля дзесяцідзённага галадання пачалася генеральная атака на паўпрыдушаных "паразітаў". Першым у спісе атакуючых стаяў чырвоны мухамор.

Мухаморная атака падтрымлівалася крэалінам, які ў гаспадарчай практыцы, як вядома, выкарыстоўваецца для барацьбы з сельскагаспадарчымі шкоднікамі, а таксама ў ветэрынарнай практыцы. Потым у бой уступіла галоўная сіла — газа (керосін). Магістр увёў яшчэ адзін рэзерв — сямейную мачу. Штодзённа на працягу дзвюх гадзін ёю расцірала ўсё цела, апрача жывата.

Выкарыстоўваўся і корань бадану. І хаця харчаванне было выключна вегетарыянскім, нічога не дапамагала. На месцы пухліны ўзнікла язва і пачала павялічвацца, на што гора-лекар адказаў: хвароба выходзіць наверх.

Жанчыне здалося, што ўсё гэта ёй ужо не пад сілу, і яна нарэшце зразумела — без скальпеля не абысціся. Магістр растлумачыў учынак жанчыны здрадай і яе недасведчанасцю.

Бедная, гаротная жанчына! Два гады асабістых намаганняў і цярплівасці спатрэбіліся ёй, каб усё гэта вытрываць. Але ж няма ніякай упэўненасці, што і пасля аперацыі яе здароўе паправіцца. Занадта ж многа змарнавана часу. І ў гэтым вінаваты "магістр" акультных навук. Ён жа сапраўдны прайдзісвет. Яго трэба судзіць. Але хто гэтым будзе займацца? Дзе адпаведныя законы? Ды і гаротніца адмаўляецца нават назваць яго імя.

Цяпер амаль што афіцыйна статус медыка маюць шматлікія экстрасенсы, знахары, ведзьмары і ліха ведае яшчэ якія ашуканцы. Далей няма куды ісці, нават цэнтральныя газеты друкуюць інтэрв'ю аднаго народнага лекара, які раіць дыягнаставаць злаякасныя пухліны з дапамогай... чырвоных буракоў. Справа дайшла да таго, што адна шаптуха запатрабавала ад мясцовых улад правесці ў яе хату водаправод: ёй, бачыце, не хапае для пакутуючых хворых асвечанай калодзежнай вады. Ці яшчэ: вядомы экстрасенс раіць у час яго выступлення па тэлебачанні ставіць перад тэлевізарам бутэльку з вадой або губную памаду, якія будуць зараджацца "пазітыўнай энергіяй", нават калі гаспадары пойдуць у тэатр.

У Міністэрстве аховы здароўя глядзяць на ўсё гэта абыякава. Нават не здзіўлюся, калі ад яго імя запатрабуюць выдзеліць грашовыя сродкі для стварэння цэнтра па лячэнню ракавых хвароб на аснове дасягненняў акультных навук.

Дык што ж гэта за цемрашальства такое апанавала? Няўжо вяртаемся да сярэднявечча? Запланаваны цыкл сеансаў радыёспірытызму... Першая такая перадача ўжо прайшла. Ёсць надзея, што неўзабаве ўдасца з дапамогай радыё выклікаць духаў вядомых у мінулым дзеячаў і спытацца ў іх, як нам выйсці з такога бядотнага становішча і як пазбавіцца ад хвароб, і заадно ад гэткіх гора-лекараў?

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

ЗАМЕЖЖА

*ІТАР-ТАСС * ІНТЭРФАКС * НАРОДНАЯ ГАЗЕТА *

Пульс дня

Украінскі міністр выказаў разуменне

Федэральны прэзідэнт Аўстрыі Томас Клестыль выказаў сур'ёзную занепакоенасць у сувязі з рашэннем украінскага парламента прадоўжыць эксплуатацыю Чарнобыльскай АЭС.

Ён падкрэсліў гэта ў ходзе сустрэчы з міністрам замежных спраў Украіны Анатолем Зленкам. Выказаўшы разуменне пазіцыі Аўстрыі, украінскі міністр у той жа час падкрэсліў, што гэта рашэнне было прынята на падставе заключэння экспертаў, а таксама зыходзячы з эканамічных меркаванняў.

Украіна стане бяз'ядзернай, калі...

Украіна імкнецца вызваліцца ад ядзернай зброі, якая дасталася ёй у спадчыну ад былога СССР, але востра мае патрэбу ў буйнамаштабнай замежнай дапамозе для ажыццяўлення гэтай задачы, заявіў міністр замежных спраў Украіны Анатоль Зленка ў інтэрв'ю японскай газеце "Сэкай ніпо".

"Украіна стане бяз'ядзернай дзяржавай, калі нам будзе прадастаўлена адпаведная дапамога для дэмантажу ядзерных узбраенняў", — адзначыў міністр.

Разам з тым ён намякнуў на магчымасць таго, што Кіеў будзе імкнуцца захаваць пэўны час ядзерны патэнцыял, указаўшы, што "важнейшай задачай для нас з'яўляецца забеспячэнне бяспекі і суверэнітэту Украіны".

Быць аэрапорту. Міжнароднаму

Буйная амерыканская карпарацыя "Скідмор, оуінгз энд мэрыл" заключыла кантракт з расійскімі ўладамі на будаўніцтва міжнароднага аэрапорта ў Паўднёва-Сахалінску.

Як паведаміў штотыднёвік аэракасмічнай прамысловасці ЗША "Авіэйшн уік энд спэйс тэкноладжы", працу над праектам будзе ажыццяўляць створаная для гэтых мэт сумесная расійска-амерыканская кампанія.

А пакутуюць жа мірныя...

"Савет Бяспекі ААН выказвае сваю глыбокую занепакоенасць паведамленнямі аб пагаршэнні сітуацыі ў Цэнтральнай Босніі, дзе эскалацыя ваенных дзеянняў сур'ёзна пагражае бяспецы грамадзянскага насельніцтва", гаворыцца ў заяве Старшыні СБ Жазэ Луіш Жэзуш (Каба Вэрдэ).

Савет Бяспекі патрабуе, каб усе бакі і іншыя адпаведныя суб'екты ўстрымліваліся ад любых дзеянняў, якія пагражаюць бяспецы і дабрабыту грамадзянскага насельніцтва.

А зброі стане менш?

Аб'ём продажу зброі краінам Блізкаўсходняга рэгіёна працягвае зніжацца, адзначае ў сваім апошнім нумары штотыднёвік "Авіэйшн уік энд спэйс тэкноладжы".

Паводле даных часопіса, які спасылаецца на распаўсюджаны нядаўна на Капіталійскім узгорку даклад даследчыцкай службы кангрэса, ЗША працягваюць заставацца галоўным экспарцёрам зброі ў дзяржавы Блізкага Усходу.

Страшная трагедыя

Выкліканыя прайшоўшымі на мінулым тыдні праліўнымі дажджамі паводкі на Атлантычным узбярэжжы Гандураса забралі жыцці 174 чалавек, 450 прапалі без вестак, а колькасць пацярпеўшых склала 12 тысяч чалавек.

Паводле слоў прадстаўнікоў выратавальных і санітарных службаў, дакладней колькасць загінуўшых і прапаўшых без вестак грамадзян на сённяшні дзень устаноўлена быць не можа, паколькі доступ у шэраг затопленых раёнаў ускладняецца або наогул немагчымы.

Лютуе ліхаманка Дэнге

Маштабы эпідэміі ліхаманкі Дэнге ў Коста-Рыцы прымаюць пагражальны характар, заявіла намеснік міністра аховы здароўя Эміліа Леон.

Акрамя звычайнай ліхаманкі Дэнге, якая ахапіла, паводле афіцыйных даных, больш як 2 тысячы чалавек, у апошнія дні адзначаны выпадкі захворвання найбольш цяжкай формай ліхаманкі, якая выклікае кровацячэнні.

Ну і ну!

Спрытныя рукі і ніякага махлярства

Як сцвярджае часопіс "Нэшнл інквайрэр", Скіп Экерт (на здымку) — самы лепшы ўзломшчык сейфаў у свеце. У турме ён не сядзеў і ні разу не ўкраў ні граша. Уся справа ў тым, што гэта яго прафесія. Незалежны ўзломшчык сейфаў зарабляе тысячы долараў, раз'язджаючы па ўсім свеце і выконваючы заказы законных уладальнікаў незгаральных шафаў. Не так даўно ён вярнуўся з Рыада (Саудаўская Аравія), дзе адчыняў сейф аднаго з мясцовых прынцаў, які згубіў шыфр да свайго тайніка. Ламаць дарагое прыстасаванне прынц не хацеў, таму давялося яму звярнуцца да паслуг спецыяліста. Уся работа заняла дзве гадзіны. Сакрэт майстра ў асаблівай адчувальнасці ягоных рук, асабліва пальцаў.

Дзіўна, але ў каледжы ён вучыўся іграць на гітары, а, атрымаўшы адукацыю, пайшоў вучнем да слесара-замочніка. Для праверкі таленту ўзломшчыка сейфаў, які адкрыўся ў яго, Скіп удзельнічаў у шматлікіх конкурсах і заўсёды перамагаў. "У прынцыпе, маючы дастаткова часу, я магу адчыніць любы сейф", — сцвярджае чэмпіён свету, якому ўсяго 31 год.

Работаешь в центре Лондона? Получай доплату за "трудности" жизни... И какую!

Реальная стоимость жизни в центре большого города любой страны значительно выше, чем на окраине. Это понятно всем.

Там всегда более дорогие магазины, услуги, не говоря уже о жилье.

Однако далеко не каждое правительство делает из этого факта должные выводы, как, например,консервативное английское. Оно оплачивает работу государственных чиновников в зависимости от места их работы. Например, служащий в центре Лондона получает доплату в размере 2 тысяч фунтов стерлингов в год. На окраине столицы — всего тысячу. А в некоторых районах доплат вообще не делают.

Правда, в частном секторе эти доплаты — у нас бы сказали: "районные коэффициенты" — еще выше. В банках, например, они составляют от 3 до 6 тысяч фунтов в год.

Таким образом, только месячная доплата "за трудности жизни" в центре Лондона превышает годовую зарплату абсолютного большинства наших граждан.

Владимир БОРИСОВ.

Отцы-командиры угостили солдата розгами

Ида-Віруский уездный суд принял к рассмотрению уголовное дело по обвинению должностных лиц учебного центра департамента пограничной охраны Эстонии в насилии по отношению к солдату срочной службы.

В обвинительном заключении говорится, что в местечке Ремнику, где обучаются будущие стражи границы, практиковался такой метод воспитания, как наказание шпицрутенами. Солдаты по приказу командира устраивали порку своему товарищу розгами, которые он сам себе вынужден был наломать. Поводом к первой экзекуции (50 розог) стал тот факт, что отцы-командиры обвинили в симуляции больного солдата, который, как затем оказалось, нуждался в длительном лечении. Вторая порка и избиение солдата произошли после того, как он, униженный и избитый, бежал из части, но был пойман.

Найден трехкилограммовый самородок платины

Редкая удача выпала золотоискателям Приамурья.

В Аяно-Майском районе Хабаровского края найден самородок платины весом более трех килограммов. Об этом сообщила газета "Тихоокеанская звезда", подчеркнув, что найден самый большой самородок платины в истории горнодобывающей промышленности России.

Эўрыка!

Самалёт на сонечных батарэях

Прынцыпова новы лятальны апарат, энергасілкаванне якога часткова ажыццяўляецца за кошт сонечных батарэй, паспяхова прайшоў першыя выпрабаванні на базе ВПС ЗША Эдвардс у Каліфорніі.

Аб гэтым заявілі прадстаўнікі Ліверморскай лабараторыі радыяцыі імя Лаўрэнса. Беспілотная машына, якая па форме нагадвае крыло, атрымала назву "Пасфайндэр" ("Дазорны").

Вага лятальнага апарата — усяго 195 кілаграмаў, даўжыня — 31 метр, шырыня — 2,4 метра. Ён аснашчаны васьмю прапелерамі, якія круцяцца электраматорамі. У ходзе выпрабавальнага палёту, які працягваўся 41 мінуту, апарат развіваў хуткасць да 26 кіламетраў у гадзіну і праляцеў шэсць разоў па двухкіламетроваму кругавому маршруту на вышыні 60 метраў. Па меншай меры 60 працэнтаў электрасілкавання матораў у ходзе палёту забяспечвалася за кошт сонечных батарэй, размешчаных на паверхні крыла. Астатняя электраэнергія забяспечвалася за кошт акумулятараў. "Усё функцыяніравала вельмі добра, і мы вельмі задаволены вынікамі", — так пракаменціраваў вынікі палёту Рэй Морган, віцэ-прэзідэнт "Аэравіранмент інкарпарэйшн", якая сканструявала і пабудавала "Пасфайндэр".

Праект, у якім таксама прымае ўдзел урадавая арганізацыя па стварэнню абароны ад балістычных ракет (АСАБР) пры тэхнічным садзейнічанні Ліверморскай лабараторыі, распрацоўваецца па заказу Пентагона. Першапачаткова работы над праектам праходзілі ў рамках стратэгічнай абароннай ініцыятывы (САІ), мэтай якой была распрацоўка шырокамаштабнай сістэмы супрацьракетнай абароны.

"Пасфайндэр" быў задуманы як сродак барацьбы з ракетамі малой дальнасці. Ён павінен лятаць на вялікай вышыні над раёнамі баявых дзеянняў на працягу тыдняў і нават месяцаў. Датчыкі, якія знаходзяцца на яго борце, павінны засякаць запушчаныя балістычныя ракеты і знішчаць іх з дапамогай невялікіх ракет-перахватчыкаў.

Цяпер плануецца правесці яшчэ пяць лётных выпрабаванняў з мэтай адпрацоўкі сістэм, а ўжо да лета будучага года будуць праведзены палёты "Пасфайндэра" на вышыні амаль 20 тысяч метраў.

Ход конем

Кампоманес делает хорошую мину при плохой игре?

Валерий ФЕДОРЦОВ

Каспаров, а затем и Карпов стали чемпионами мира. Первый — по версии лондонского журнала "Таймс", второй — по версии ФИДЕ. Два чемпиона плюс непризнанный, но считающий себя таковым — Роберт Фишер.

Сегодня мы предлагаем вашему вниманию эксклюзивное интервью, которое президент Всемирной шахматной федерации (ФИДЕ) Флоренсио Кампоманес дал корреспонденту ИТАР—ТАСС по окончании матча за мировую шахматную корону между Анатолием Карповым и голландцем Яном Тимманом.

— Нынешний матч, проходивший в Голландии и Индонезии, был воистину матчем на первенство мира, единственным подобного рода состязанием — чемпионским матчем между двумя игроками. И в то же время это был матч, за которым стояли 250 национальных организаций шахмат всего мира. Поэтому для него нет сравнения. Игроки должны следовать определенным правилам и нормам. В противном случае наступает анархия. Карпов и Тимман могут служить прекрасным примером для молодых людей как джентльмены и шахматисты. Чего нельзя сказать о другой паре, проводившей матч в Лондоне.

Матч по версии ФИДЕ — подтверждение стабильности в шахматном мире. Он войдет в историю, ибо знаменует успех этой организации, выдержавшей настоящую "бурю". Институты сильнее, чем индивидуумы. Будет еще много больших гроссмейстеров, больших шахматистов, много Карповых, Каспаровых, Тимманов, Шортов... Но они приходят и уходят, равно как приходят и уходят президенты ФИДЕ. Но ФИДЕ как институт сохраняется, живет.

— Что вы думаете об организации матча?

— Если спросить игравших и их делегации, уверен, они в один голос заявят, что это был очень хорошо организованный матч. Были созданы прекрасные условия, делегации окружены заботой, их встречали гостеприимно и тепло, им улыбались отзывчивые люди. Такова Индонезия. Она стала страной шахмат. Шахматы здесь прочно вошли в быт народа, в них играют даже в далеких горных деревнях. Скажем, в Северной Суматре шахматы так же популярны, как бейсбол в американских дворах или футбол в Бразилии, Аргентине или Германии.

— Что вы можете сказать о возможности встречи Карпова с Каспаровым?

— Я не буду строить какие-либо прогнозы или комментировать возможности. Ясно одно — нынешний матч дал чемпиона мира. Остальное покажет будущее.

Шахматы

Юбилей классика

Сто лет назад была опубликована первая задача Александра Троицкого, с которой начался блестящий творческий путь выдающегося мастера шахматной композиции. Всего Троицкий составил и опубликовал около 800 композиций, в том числе 750 этюдов. За выдающиеся достижения в области шахматного искусства в 1928 году Троицкий был удостоен почетного звания заслуженного деятеля искусств РСФСР. Познакомьтесь с одним из изящных произведений великого мастера.

А.Троицкий

Белые: Кре4, пп. d2, e6 (3).

Черные: Кре2, Kh2, п. c4 (3).

Выигрыш.

1. Kpf4! (Напрашивающееся 1. e7? красиво опровергалось после 1...Kg4 2. Kpf5 Kf6! 3. Kp:f6 Kp:d2 4. e8Ф c3 5. Фd8+ Kpc1, и у белого ферзя нет шаха на g5. В этом смысл жертвы коня на f6!) 1...Kg4 (Если 1...Kp:d2, то 2. e7 c3 3. e8Ф c2 4. Фe3+ Kpd1 5. Фd3+ Kpc1 6. Kpe3 с несложным выигрышем) 2. Kp:g4 Kp:d2 3. e7 c3 4. e8Ф c2. Интересно, что при положении белого короля на f6 ничья даже при черной пешке на c3. Теперь же белые достигают выигрыша, несмотря на то, что черная пешка достигла поля c2. Все дело в позиции белого короля! 5. Фd7+ Kpc1 (Или 5...Kpc3 6. Фg7+ Kpd2 7. Фb2 Kpd1 8. Kpf3) 6. Фb5 Kpd1 7. Фb3 Kpd2 8. Фb2 Kpd1 9. Kpf3! c1Ф 10. Фe2x

Победа Алексея Федорова

Сильный состав собрал чемпионат Беларуси по шахматам среди мужчин (высшая лига). В борьбе за звание чемпиона республики и места в сборной команде Беларуси приняли участие международный гроссмейстер Виктор Купрейчик, 5 международных мастеров, победители отборочных соревнований. Турнир соответствовал VIII категории ФИДЕ, что позволило впервые установить норму международного мастера — 6 очков из 11. Соревнования прошли в очень острой бескомпромиссной борьбе, исход которой решился лишь в последнем туре. В итоге звание чемпиона Беларуси завоевал молодой международный мастер из Могилева Алексей Федоров, набравший 8 очков. Трудную дистанцию турнира он провел без единого поражения, одержав 5 побед. На очко отстал представитель Минской области 20-летний Алексей Александров. Нелегким оказался старт турнира для Виктора Купрейчика, потерпевшего в первых двух турах поражения. Однако в дальнейшем гроссмейстер сумел выправить ситуацию, одержав 5 побед. В итоге он набрал 6,5 очка и завоевал бронзовую медаль. Такой же результат показал дебютант чемпионата молодой минчанин Александр Рустемов. Следует отметить успех 17-летнего Юрия Шульмана, который набрал 6 очков. Он вместе с Рустемовым выполнил норму балла международного мастера.

Нататкі падарожніка

Мы не можам ужо не ісці!..

Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ

— Будзем эвакуіравацца!

Гэтыя два словы вылецелі самі, нечакана для мяне. Вадаспад, павялічыўшыся разоў у дзесяць, ужо не проста бурліў — роў, як паранены мядзведзь, і з нянавісцю рваўся да дзвюх нашых палатак, што спалохана прытуліліся да падножжа скалы.

— Будзем эвакуіравацца!

У гэтым воклічы выявіліся спалох, горыч асабістай памылкі — што менавіта ў гэтым, казачна прыгожым месцы некалькі гадзін раней уздумалася паставіць палаткі.

...Увесь дзень імжэў нудны дождж: то змяняўся малочным туманам, то ўзмацняўся. Мы ішлі па азімуту, спадзяючыся выйсці да рачулкі Джурлы. Думалі, потым будзе лягчэй знайсці вадаспад. Мы знайшлі яго, спыніліся крыху ніжэй, каля міленькага і элегантнага лісяняці. Хто мог падумаць, што навальніца ператворыць яго ў раз'юшанага мядзведзя? Тады, спускаючыся да групы, я запэўніваў:

— Зараз вы ўбачыце цудоўнейшае месца. Не было ў нас яшчэ лепшага начлегу!

Вадаспад і сапраўды выглядаў дзівосна прыгожым. Побач заставаўся малюсенькі пятачок сухой зямлі, вада, агібаючы яго, імкнулася далей, уніз. Некалькі вялікіх дрэў, якія толькі верхавінамі сваімі выглядалі з каньёна, ды старое вогнішча і скала, што навісла над намі, дапаўнялі карціну і надавалі ёй закончанасць і непаўторнасць. Усё было вельмі прыгожа. Тады. Але... не цяпер...

— Эвакуіравацца! — мокрыя рэчы ляцяць у адны мяшкі, сухія — у другія, у палатцы ўжо па костачкі вады: стаім якраз ля адхону, усё да нас сцякае. Група мітусіцца, спяшаецца. Небяспека — вось яна — шалее побач.

— А раптам не затопіць?

Нечыя словы тонуць у грукаце вадаспада.

Падыходжу да яго, высвечваю ліхтарыкам равучую пашчу, спрабую вызначыць, наколькі хутка ён павялічваецца. А можа, і сапраўды рызыкнуць?

Яшчэ імгненне — і мы на паўтара метра перасоўваемся вышэй, перастаўляем палатку, старанна абкопваем, закрываем плёнкай. Цішыня ўнутры, дзікі роў звонку. Першае дзяжурства — маё...

22.45. Вада за два метры ад крайняй палаткі, вадаспад бурліць, і плынь мацнее... Але ёсць надзея: вада ж сцякае, рачулка не такая і вялікая: да вяршыні толькі метраў 500...

23.00. Вада паднімаецца, наблізілася да крайняй палаткі сантыметраў на 35. Мяне б'юць дрыжыкі. Ад холаду? Наўрад. Праціскаючыся ў палатку, працягваю рукі да запаленай свечкі — яны трасуцца. Усё цела трасе... Радуе адно: усе астатнія пакуль што супакоіліся, яны блізка да вадаспада не падыходзілі, сваімі вачыма не бачылі, з якой хуткасцю ён павялічваецца...

23.15. Вада прыбывае.

23.30. Прыбывае! Думкі мітусяцца, як звар'яцелыя. Інстынктыўна пачынаю выглядваць месца на схіле: можа, туды перанесці палаткі? І раптам пранізвае ідэя: а чаму б не пашырыць рэчышча? Павелічэнне сцёку вады — вось выратаванне!

24.00. Альпенштокамі, сякерамі рубім зямлю. У зубах трымаю ліхтарык, па голай спіне хлешчуць халодныя і злыя кроплі. Вывернутыя камяні спіхваем у мутны паток, і яны знікаюць імгненна — рэчышча павялічваецца!

...А раніцай зноў казачная прыгажосць: вадаспад — праўда, не пяшчотны і ціхі, але зноў лісяня — глядзіць прама на ўсход. Сонца, што толькі прачнулася, ляніва пазалочвае лісце, прабіваецца скрозь рэдкі туман, адлюстроўваецца ў тысячах залацістых іскрынак...

З усіх паходаў менавіта гэта ноч мне часцей за ўсё ўспамінаецца. Закрываючы вочы, яскрава бачу твар раз'юшанага вадаспада-мядзведзя. Нават зараз, калі побач — у чарговы раз складзены рукзакі.

Мы зноў нешта шукаем. Зноў нешта перашкаджае нам заставацца ў родным горадзе, зноў і зноў цягне невядома куды. Чаму? Усе мы — звычайныя людзі: урачы, інжынеры, прадаўцы, журналісты, у кожнага свая работа, свае звыклыя абавязкі і захапленні. Але надыходзіць імгненне, і мы, і тысячы такіх, як мы, зрываемся і знікаем на тыдзень, два, тры... Навошта?

— Навошта вам гэтая пустыня, горы?

Цягнік Кіславодск—Ташкент маркотна паўзе ўздоўж дзяржаўнай граніцы. Справа бясконцай стужкай плывуць слупы з калючым дротам, злева — пустата, толькі зрэдку з'яўляюцца абыякавыя аднагорбыя вярблюды. Выпадковы спадарожнік не ўціхамірваецца:

— Вось гарады — я разумею. Масква, Санкт-Пецярбург ці нават Мінск ваш. Там ёсць што паглядзець, ёсць чым заняцца. А пустыня?

Што для нас пустыня? Мы выбіраем маршрут, вырываемся з ланцугоў штодзённасці. Мы палімся на сонцы, нясём на сабе ваду і радуемся, як дзеці, калі выпадкова натрапім на калодзеж. Адыходзім ад яго, і пясок ажывае пад нагамі. Пясок, сонца і гарызонт зноў становяцца членамі нашай групы. Спачатку жаданымі, потым ненавіснымі. Мы змагаемся з імі, пераадольваем сябе — і з'яўляецца цуд. Возера іскрыцца, возера кліча, пяшчотна шэпча і смяецца. Сутаргава раскрываем карту і не ведаем, чаму верыць: вачам сваім ці ёй. А возера плыве, прыцягвае, ласкава нас кліча. Мы ідзём, і яно ў такт махае сіняй хусцінкай, мы спыняемся — яно засмучана прысядае, чакальна паглядвае, падахвочвае: "Ну, чаго ж вы?"

Мы ўсе ў пустыні ўпершыню, праціраем вочы і злуёмся. Яно таксама злуецца на нас і яхідна ўсміхаецца: "Гэта вам не Беларусь..." Сонца абыякава пагойдваецца і патроху апускаецца. Не саюзнік нам і не вораг. Пабочны назіральнік. Разам з апошнімі промнямі знікае і возера-цуд.

Дык навошта нам пустыня, горы? Навошта мы трасёмся ў агульных вагонах, дабіраемся на самалётах, каб недзе ў пясках шукаць закінуты калодзеж? Навошта нам лезці ў невядомую рэчку ці караскацца на непрыступную скалу? Навошта начаваць на снезе ці мокнуць да нітачкі дзе-небудзь на балоце? Тысячы турыстаў давалі адказы на гэтыя пытанні. Але яны ўзнікаюць зноў і зноў. Яны будуць вечна стаяць і перад тымі, каму не сядзіцца дома, і перад аматарамі адпачываць каля тэлевізараў.

У кожным з нас жыве рамантык. Мы хочам праверыць сябе і сваіх таварышаў у крытычнай сітуацыі. Хочам убачыць нешта новае і незвычайнае. Хочам, каб наш горад зноў стаў блізкім і дарагім, а работа, звыклыя заняткі — самымі жаданымі. І яны становяцца!

Мы вяртаемся ў штодзённую мітусню новымі людзьмі, уключаемся ў звычайнае жыццё. Усё добра, усё цудоўна, але праз некаторы час вобраз бурлівай рэчкі, непакоранай вяршыні, няпройдзенага маршруту зноў авалодвае намі. Мы не можам ужо не ісці...

P.S. Гэтыя нататкі былі напісаны яшчэ тады, калі, атрымліваючы звычайную інжынерскую зарплату, можна было пабываць і ў Фанскіх гарах, і на Каўказе, дзе зараз вайна, і на Алтаі, на Камчатцы, дабрацца куды проста не хопіць грошай. Але ж людзі, якія любяць падарожнічаць, усё роўна не сядзяць на месцы. Якія ў іх ёсць магчымасці цяпер? Аб гэтым чытайце ў заўтрашнім нумары.

❑ *Алтай, Туркменія.*

Фота аўтара.

Советы доктора Куреннова

Заповеди будущей матери

Если решили иметь ребенка, то нужно думать не только о себе, а прежде всего про маленькое существо, которое должно появиться на свет. Обязательное условие: ни женщина, ни мужчина не должны употреблять спиртного перед первой брачной ночью и тогда, когда думают о зачатии ребенка. Но вот женщина почувствовала, что она беременна. Не нужно особенно изменять в связи с этой радостной вестью ритм своей жизни.

Работайте, много двигайтесь, особенно полезны легкие работы, прогулки на свежем воздухе. Не поднимайте ничего тяжелого, не бегайте. Ваш будущий ребенок не любит контрастов. Следовательно, избегайте купания в холодной или в сильно горячей воде. С философским покоем смотрите на жизнь, приучите себя не нервничать по мелочам, не допускайте ссор, конфликтов.

Многих волнует вопрос: что можно и что нужно есть. Основных своих привычек не меняйте. Но если до сих пор любили употреблять много острого, соленого, сладкого, то, естественно, сдерживайте свои желания. Старайтесь есть много фруктов, овощей, сыра, каш. Меньше мяса и больше рыбы, меньше сахара и жиров, больше свежей зелени, ягод. Если ваша беременность в основном пришлась на зиму, компенсируйте недостаток витаминов, микроэлементов отварами шиповника, некоторых трав, компотами, квашеной и свежей капустой, свеклой, морковью, луком. Следите за своим весом. Он не должен увеличиться больше, чем это предусмотрено нормой (увеличение массы матки, околоплодные воды, рост самого ребенка). Большой вес уменьшит вашу подвижность, затруднит роды. У некоторых молодых женщин незадолго до родов появляется какая-то тревога, нарушается сон. Вечерняя прогулка, полстакана отвара трав с мятой снимут неприятные ощущения.

Праграма тэлеперадач

Чацвер, 11 лістапада

Беларускае тэлебачанне

13.40. "Вязень замка Іф". Маст. фільм. 3-я серыя.
15.15. "У Мумі-Дол прыходзіць восень". Мультфільм.
15.30. Праціўстаянне.
16.20. "Музыка працягваецца..." Фільм-канцэрт.
16.45. Тэлебіржа.
16.55. Геаграфія Беларусі. 9-ы клас.
17.25. "І не толькі пра каханне..." Тэленавела.
17.50. Зачытайце мае пісьмо...
17.55. Здароўе. Тэлечасопіс.
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Футбол. Міжнародная таварыская сустрэча. Алімпійская зборная Беларусі — алімпійская зборная Украіны. У перапынку (19.45). — Рэпартаж з адкрыцця нацыянальнай выстаўкі "Польшча-93".
20.45. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. "Салодкі ручай". Тэлесерыял.
22.40. Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя.
22.45. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — "Крок".

Канал "Астанкіна"

15.15. "Прыгоды Тэдзі Раксліна".
15.40. Рок-урок.
16.20. ...Да 16 і старэйшым.
17.00. Навіны.
17.25. Дак. фільм "Пры святле газавых ліхтароў".
17.55. Дакументы і лёсы.
18.00. Надвор'е.
18.05. "Проста Марыя".
18.55. У гасцях ва ўлады.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато "Мільён".
21.10. Маст. фільм "Твін Пікс" (ЗША). 3-я серыя.
22.05. Песня-93.
23.15. Навіны.
23.30. Кіно да запатрабавання.
0.20. MTV.
1.20. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

15.25. Тэніс. "Кубак Крамля".
16.30. Штрыхі да партрэта.
17.15. М-трэст.
17.30. "Першы савет — апошні савет".
17.45. Напярэдадні.
18.15. Руская віза.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вэсці.
19.25. "Санта-Барбара".
20.20. Крымінальныя паведамленні.
20.30. Сам сабе рэжысёр.
21.00. "У вайны не жаночы твар".
22.00. Вэсці.
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. Асенні перадвыбарны марафон.
22.45. Тэніс. "Кубак Крамля".
23.20. "Пецярбургскі раманс". Памяці кінарэжысёра А.Сідзельнікава.
0.15. П.І.Чайкоўскі. Сімфонія N 6 "Патэтычная".
0.35. Да юбілею балетнай трупы тэатра оперы і балета імя М.П.Мусаргскага.

Пятніца, 12 лістапада

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. "Песні маладосці". Фільм-канцэрт.
8.50. Дошка аб'яў.
8.55. Геаграфія Беларусі. 9-ы клас.
9.25. "Салодкі ручай". Тэлесерыял.
10.20. Футбол. Зборная Беларусі — зборная Украіны.
11.50. Юрый Семянякa. Песні былога.
12.55. Родная слова.
13.30. Навіны (з сурдаперакладам).
13.40. Якуб Колас. "Іменіны". Тэлеспектакль.
15.10. "Жывыя струны". Тэлефільм.
15.45. Тэлебом. Гала-канцэрт пераможцаў шоу-конкурсу ў Мазыры.
16.35. "ПІК".
17.30. "Пейзаж пасля бітвы". Дак. фільм.
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Гандбол. СКА (Мінск) — "Гранітас" (Каўнас).
19.45. Чарнобыль: праблемы і вырашэнні.
20.35. Кантакт.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. "Шчыра Ваш..." Маст. фільм.
23.15. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Канал "Астанкіна"

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. "Два мядзведзяняці". Мультфільм.
8.35. Фільм — дзецям.
10.00. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
10.50. Прэс-экспрэс.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Амерыка з М.Таратутам.
11.50. "Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары". Частка 2-я.
13.00. "Мы малюем". Мультфільм.
13.10. "Так хочацца пакінуць усіх жывых".
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.05. Фільм — дзецям. "Цуды ў Гарбузянках".
16.30. Свята часопіса "Століца".
17.00. Навіны.
17.20. Праблема прыватызацыі ў краінах Садружнасці.
17.40. Надвор'е.
17.45. Чалавек і закон.
18.15. Амерыка з М.Таратутам.
18.45. Поле цудаў.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Чалавек тыдня.
21.00. Маст. фільм "Твін Пікс" (ЗША). 4-я серыя.
22.00. Музагляд.
22.45. Праграма "Х".
23.00. Навіны.
23.25. Палітбюро.
0.05. Аўта-шоу.
0.35. Хіт-канвеер.
1.40. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

7.00. Вэсці.
7.20. Патрабуюцца...патрабуюцца...
7.30. Час дзелавых людзей.
8.00. Паехалі.
8.10. "У вайны не жаночы твар".
9.05. Ранішні канцэрт.
9.25. Белая ворона.
10.05. Спявае Л.Трухіна.
10.40. Паралелі.
10.55. "Санта-Барбара".
11.45. Мульці-пульці. "Пампаліні хэпі-бэйбі".
11.55. Пілігрым.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вэсці.
13.25. Тэлеспектакль М.Мітуа. "Акампаніятар".
13.50. "Настальжы" — музыка ўсіх пакаленняў.
14.20. Крыніцы.
14.50. Мульці-пульці.
15.10. Там-там навіны.
15.25. Тэніс. "Кубак Крамля".
15.55. Пагаслая зорка?
16.55. Дысней па пятніцах. "Хлапчук з заліва Мёртвых".
17.55. Як упраўляць Расіяй.
18.15. Лясы.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Вэсці.
19.25. "Пяць вечароў". Маст. фільм.
21.00. "САС".
22.00. Вэсці.
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. З залы Вярхоўнага суда РФ.
22.50. Тэніс. "Кубак Крамля".
23.20. Вячэрні салон.
0.50. Клуб "Жоўтая падводная лодка".

Тэатры

11—12 лістапада
Пачатак у 19.00

ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА

11 лістапада — Вечар старадаўняга рамансa;
12 лістапада — "Карміна бурана". Вакальна-харэаграфічнае прадстаўленне ў адной дзеі. "Кармэн-сюіта". Балет у адной дзеі.

ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

11 лістапада — прэм'ера "Саўдзельнікі";
12 лістапада — "Тутэйшыя".
Папярэдні заказ білетаў па тэл. 27-17-17.

БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІЯ (канцэртная зала)

12 лістапада — III міжнародны фестываль "Адраджэнне беларускай капэліі". Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь. Дырыжор — А.Лысенка. Салісты: А.Вінакураў (скрыпка, Аўстрыя), Т.Варадзі (меца-сапрана). Я.Папляўскі, П.Зінгер, П.Хіндэміт. Спонсары: LOT, мастацкая галерэя "Лідвіны", Белпрамбудбанк, Белаэратрансбанк, фінансава-прамысловая група "Рамос" інвестыцыі ў Рэспубліку Беларусь, фірма "Tetra Laval A/O".

(зала камернай музыкі)

11 лістапада — канцэрт камернай музыкі. А.Вінакураў (скрыпка, Аўстрыя), П.Зінгер (фартэпіяна, Аўстрыя). У праграме: Моцарт, Брамс, Зінгер, Шнітке.

Надвор'е

Сёння днём па рэспубліцы захаваецца халоднае без ападкаў надвор'е. Тэмпература паветра ў Гродне, Брэсце — 7—9, Гомелі, Мінску — 9—11, Магілёве, Віцебску — 10—12 градусаў марозу.

У наступныя двое сутак надвор'е без істотных ападкаў. Тэмпература паветра ноччу — 13—18, месцамі да 23, днём — 9—14 градусаў марозу.

Астранамічны каляндар — 11.11

Узыход і заход сонца: Мінск — 7.29, 16.19; Віцебск — 7.24, 16.04; Магілёў — 7.18, 16.04; Гомель — 7.12, 16.09; Гродна — 7.45, 16.38; Брэст — 7.38, 16.41.

Даўжыня дня ў Мінску — 8 гадзін 50 хвілін.

Маладзік — 13 лістапада.

Народная газета

Рэкламнае бюро — тэл./факс — (0172) 68-25-29.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, калі ў матэрыялах змешчаны даныя, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Лісты чытачоў друкуюцца на мове арыгінала. Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Рэдакцыя "Народнай газеты" прымае заказы на змяшчэнне аб'яў, рэкламы.

Рэдакцыйныя тэлефоны: прыёмная галоўнага рэдактара — 68-28-70; намеснікі галоўнага рэдактара — 68-28-79; юрыдычнае бюро — 68-25-98; стыльрэдактар — 68-26-03; мастак — 68-26-36; бухгалтэрыя — 32-46-55; бізнес-бюро — 68-26-87.

Аглядальнікі па пытаннях дзейнасці: парламента рэспублікі, грамадска-палітычных арганізацый і рухаў — 68-26-82; урада рэспублікі — 68-28-63; дзяржаўных органаў — 68-26-57; аграрнай палітыкі — 68-25-56; экалогіі, ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай трагедыі і НТП — 68-25-97; сацыяльнай пераарыентацыі эканомікі — 68-26-56; сацыяльнай пераарыентацыі сферы абслугоўвання — 68-25-98; сацыяльнага вывучэння грамадскай думкі і аналізу пошты — 68-25-59; культуры і нацыянальнага адраджэння — 68-25-96; маралі і права — 68-25-07, 68-26-76; сацыяльнай абароны асобы — 68-26-89; адміністрацыйных органаў — 68-26-78; аператыўных падзей, фізкультуры і спорту — 68-25-96; палітычныя каментатары — 68-26-74, 68-26-77.

Тэлефоны карэспандэнцкіх пунктаў: у Брэсце —5-73-19; у Віцебску — 5-12-12; у Гомелі — 55-81-05; у Магілёве — 26-35-38; у Маскве — 365-16-44 в Берліне — (104930) 229-50-14.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул Б. Хмяльніцкага,10а.

Індэкс 63868

Заснавальнік — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.
Адрас: Мінск, вул. К. Маркса,38.
Выходзіць штодзённа, акрамя нядзелі і панядзелка.
250 разоў у год.
Падпісана ў друк у 19.10.
Газета аддрукавана ў друкарні выдавецтва"Беларускі Дом друку". Адрас: Мінск, праспект Ф. Скарыны,77.
Спосаб друку — афсетны, фармат А-2
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ